**МАРОЗ Фёкла Міхайлаўна (1906 г., в. Новыя Марозы):**

— Нашай вёскі зараз няма. А тады ў нашай лазні адзін чалавек жыў. З тых, што ў палон не здаваліся. Іван Пятровіч, з Каўказа. Ежу мы насілі яму. Даведалася, што на Асвейшчыне партызаны ёсць, пераказала. Пайшоў. Яны былі харошыя хлопцы. Аднойчы ноччу 20 чалавек зайшло ў хату. Адзін з іх: «Пацішэй, мо дзеці спяць!» І пытаюцца дарогу на чыгунку. Накармілі мы іх, дарогу паказалі...

**З баявой характарыстыкі Антона Ігнатавіча ЛІТВІНАВА, 1911 г. нараджэння, 5 класаў адукацыі, члена ВКП(б):**

«У жніўні 1941 года быў адным з арганізатараў Асвейскай падпольнай групы. Устанавіў сувязь з многімі камуністамі і заахвоціў іх да актыўнай падпольнай работы. Сярод насельніцтва пасёлка распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, быў удзельнікам першай нарады камуністаў-падпольшчыкаў. У снежні 1941 г. выбраны членам бюро падпольнага кіраўніцтва і вёў вялікую работу ў стварэнні і актывізацыі падпольных груп у сельсаветах, у зборы зброі і боепрыпасаў, рыхтаваў людзей у шэрагі народных мсціўцаў.

У маі 1942 г. Літвінаў стаў партызанам. У ліпені 1943 г. назначаны камісарам партызанскага атрада імя Пархоменкі.

Загінуў смерцю храбрых 28 снежня 1943 г.»

**З пісьма Івана Лявонцьевіча КОЎЗЕЛЯ з г. п. Асвея Верхнядзвінскаму райкому КПБ:**

«...З таго дня я на сваім агародзе пад каранямі бярозы зрабіў склеп, дзе хаваў знойдзеную мной зброю — вінтоўкі, кулямёты, патроны. Праз некаторы час да мяне прыехаў на кані з нейкім чалавекам Маліноўскі Мікалай Паўлавіч і сказаў, што ў лесе ёсць Сяргееўскі атрад партызан і што ім патрэбна зброя...»

**АБУХОВІЧ Марыя Максімаўна (1911 г., в. Вароны):**

— Брат мой, Андрэй Уселенак, жыў у Росіцы. Аднойчы ў яго спыніліся партызаны. Пасадзіў ён іх палуднаваць, а сам да банькі, на варту. Немцы ж ішлі ў белых халатах, ён іх і не прыкмеціў. Паспеў крыкнуць, каб уцякалі, ды сам не ўратаваўся. На допыце фашысты адрэзалі Андрэю язык, вушы, нос, вочы выкалалі. Усё дазнаваліся пра партызан. А жонку яго і сямёра дзяцей карнікі спалілі, калі першая экспедыцыя ішла.

леткаў, і дзіцянятак, хто крычыць: «Мама! Тата!» — тых таксама ў агонь...

**МАРОЗ Валянціна Осіпаўна (1916 г., в. Росіца):**

— 15 лютага 1943 года я падвозіла партызан да Сушкоў. Далей на заданне пайшлі самі, а мне сказалі счакаць. Пачула ўзрыў на чыгунцы, ды тут немцы стральбу ўсчалі. Два партызаны прыбеглі па каня. Прыехалі мы ў Росіцу. Я — дадому, а яны далей, у лес. А 16 лютага...

**БАРАНОЎСКАЯ Вольга Мікалаеўна (1904 г., в. Росіца):**

— Я даіла карову, тут мой сынок падбягае: «Мама! Ляціць прыгожы самалёт!»

**ШУТКО Соф'я Цімафееўна (1908 г., в. Росіца):**

— Крычаць: «Бабы, уцякайце, паляць!» Я апранула малога, у санкі яго і ў лес. Чалавек сорак бяжыць. На снезе — чорныя людзі. Далёка відаць. Ды кулі, мусіць, не даляталі...

**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Данатаўна (1914 г., в. Каменцы):**

— У Каменцах зараз тры хаты ста-

факельшчык і запаліў страху. Пагадзя выскачыў я з пуні, ды за вёскай мяне злавілі. Іду пад канвоем ля хаты, дзе Сыльва Іжык жыў. Хата яго гарыць, а певень ускочыў на плот і кукарэча. Нехта з канвою злажыўся і з вінтоўкі бах па пеўню. Той з плоту, канвойны за ім.

І чуем немы крык. Сыльву стралялі ў хаце. Яго жонку, двух сыноў, дачку забілі адразу. А Сыльва, як загарэлася хата, ачуняў: выкарабкаўся праз парог ды ў гурбу пад плот. Думаў, што надзейна схаваўся. А фашыст, калі кінуўся за пеўнем, якраз і ўскочыў на яго. Далей нас пагналі разам.

**ПІЛЮШЫНА Валянціна Васільеўна (1924 г., в Ліпаўкі):**

— З 96 двароў вёскі ў 42 дварах была радня. Я адна засталася з усяго роду.

...У тую ноч сабакі еліся, як не паломаліся. А ў 6 гадзін чуем стрэл. Карнікі па сігналу падняліся з засады. Усё скончылі да 11-ці. І на калені ставілі, і богу маліцца загадвалі. Пуня, ток і восець — адной будынінай стаялі. 178 чалавек там ляглo. 25 толькі пакінулі. Было больш, ды прыходзіць фашыст і пытае ў жанчын, хто цяжарны. Нехта прызнаецца.




**Ніводнага слова тут не прыбаўлена да таго, што сказана людзьмі, што пададзена ў дакументах. Бо нельга далучыць да вачэй Асвеі — слязінкі, да грудзей Сар'і — уздыху, да памяці Росіцы — пякельнага попелу. Усяго тут — поўніцай. На 35-ы год пайшло з часоў тых трагічных падзей, а нічога не забываецца. І як сказала мне ў Рызе зведаўшая пякельныя кругі вайны са сваімі пяццю дзецьмі Ганна Фёдараўна Шандар: «Матчына сэрца ніколі не гасне!» Як не гасне для нас ніводная драбніца з тых векапомных змагарных гадоў.**

**Таму і прашу прабачэння, што вымушаны зноў дакрануцца да народнага болю. Не, не гасне памяць, не гаснуць сэрцы, у жывых і мёртвых—не гаснуць.**

яць. 7 удоў жыве. Адна бабка на зіму да дачкі з'язджае. Ушасцёра застаёмся.

Тады ён палышоў і пашчупаў, ці праўда. Ужо будыніна дагарала, дык гэтых жанчын у жар кінулі. Адзін нямецкі па

станцаў расстралялі, а астатніх, змучаных, вярнулі ў Саласпілс. Выжыла толькі двое ці трое.

**З пісьма рыжанкі САМУСЁНАК Веры Іванаўны (1931 г., в. Слабодка):**

— З дзецьмі рабілі так: у першую групу траплялі ад аднаго года да 5—6, у другую — ад 7 да 12—13. Мы з сястрой апынуліся ў другой групе. Потым з кожнай групы выдзялялі дзяцей па знешняму выгляду. Тых, хто меў якія-небудзь барадаўкі, ранкі, болькі на целе, збіралі да кучы, а дзеці з чыстым цельцам траплялі ў асобную групу. З гэтых дзяцей якраз і высмоктвалі фашысцкія дактары-нелюдзі кроў для сваіх раненых. Ужо пасля вайны мы даведаліся, што дзяцей з гэтай групы, нашых аднавяскоўцаў, у жывых нікога не засталося.

А нашу групу вывезлі ў сельскую мясцовасць і размеркавалі як служак сярод гаспадароў. Мы з сястрою пасвілі жывёлу, выконвалі палявыя і хатнія работы.

**ХАДЗЮК Лідзія Міхайлаўна (1914 г., в. Росіца):**

— У Саласпілсе ў хлеў, куды змясцілі дзяцей, прывезлі каня здохлага. Хто еў — памёр...

**МЯДЗЮТА Валянціна Аляксандраўна (1909 г., в. Крэўнікі):**

— У «Огоньке» (№ 12 за 1945 г.)— ёсць у мяне гэты нумар, пісалі, што ў Дзмітрыя Андрэевіча Саксона, а гэта мой сын, 15 разоў бралі кроў у Саласпілсе. Знайшла яго ў Сігулдзе, у дзетдоме. Быў хворы. Як ні даглядала — памёр у 1949 годзе.

**БАДЫНСКАЯ Ганна Карпаўна (1917 г., в. Каханавічы):**

— У мяне быў сын Уладзімір Станіслававіч, 13 верасня 1941 года нарадзіўся. Мо дзе акажацца?

**БАРАНОЎСКІ Аляксей Данатавіч (1903 г., в. Росіца):**

— У 44-м, якраз на Іванаў дзень, Саласпілс немцы эвакуіравалі. Трапілі ў Нямеччыну. Калі наша войска і туды дайшло, нас у лагеры пачалі ўгаворваць: «Заставайцеся, пераходзьце на Захад, чаго вяртацца ў пусты край!» А я ім: «Хай пад голы кол паеду, але паеду на радзіму».

**УШАКОВА Ганна Васільеўна (1911 г., в. Новыя Марозы):**

— У Майданаку правяла без 11 дзён адзін год. Маладосць нас толькі трымала. І вера, што хутка сонейка ўзыдзе і прыляціць да нас салавей. Пра яго мы і песню склалі:

А жонку яго і сямёра дзяцей карнікі спалілі, калі першая экспедыцыя ішла. Так з сям'і і кораня не засталося...

**З баявой характарыстыкі палітрука I узвода I атрада брыгады імя Фрунзе Васіля Ільіча ЛУКАШОНКА:**

«В. І. Лукашонак — дабраволец-партызан з 23 мая 1942 г. Да гэтага працаваў сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі ў в. Прошкі Асвейскага раёна, якая складалася з 12 чалавек... Уся камсамольская арганізацыя ўлілася ў атрад. Такім чынам Лукашонак з'яўляецца адным з першых арганізатараў партызанскага руху на Асвейшчыне. Ён праявіў сябе як адзін з лепшых верных таварышаў, ненавідзеў нямецкіх захопнікаў і вёў з імі барацьбу як слаўны патрыёт сваёй Радзімы. Лукашонак удзельнічаў амаль ва ўсіх баявых аперацыях і заўсёды праяўляў вернасць сваім перакананням, паказваў узоры мужнасці і геройства... Яго кулямёт метка касіў фрыцаў пры разгроме нямецкіх гарнізонаў, пры ўзрыве Беніслаўскага моста праз раку Свольна, у шматлікіх засадах. Быў цяжка паранены ў руку і нагу.

5 верасня 1943 г. пры падыходзе да чыгункі група, якой камандаваў Лукашонак, наскочыла на засаду. Ён атрымаў 11 ран, але працягваў весці агонь гранатамі і аўтаматам, не выйшаў з бою...»

**КАДАШ Юзэфа Уладзіміраўна (1923 г., в. Мядзведзева):**

— У нас у тую пару партызаны стаялі. Мы абшывалі іх, кармілі, мылі бялізну. Аднойчы, прыйшоўшы з задання, кажуць: «Што каштоўнае ёсць — хавайце, пойдзе карная экспедыцыя...»

Мы ад 1941-га да 43-га немцаў на свае вочы і не бачылі. А тут — пайшлі. Самалёты стракочуць...

Добра, што нас папярэдзілі, мы і падаліся ў Мілавідаўскія лясы. А немцаў партызаны стрымлівалі, пакуль былі патроны і сілы. Мілавіды таксама былі спалены, толькі тры хаты засталіся. Але далей ужо немцы не наступалі. Ад першай экспедыцыі ўратаваліся. Ад другой — восенню 1943 года — не ўдалося...

**ВАРАХОП Анастасія Мікалаеўна (1910 г., в. Росіца):**

— Мала хто з нашых у лес пайшоў: не паспелі, ды хто верыў? Вайна, але каб людзей паліць! І ў памяці не змесціш колькі перажыта...

**ПУШЛЯК Ефрасіння Данілаўна (1914 г., в. Ракшня):**

— Маці маю на месцы спалілі. І падда дачкі з'язджае. Ушасцёра застаёмся.

А было... Во... Мароз Марыя з 1918 года. Трымала кніжку пад пахай. Карнікі падумалі, што зброя — трах яе прыкладам. Яна яшчэ крыкнула: «Мама!» Яе зноў... А потым бацьку з маткай заставілі непрытомную дачку самім занесці і кінуць у агонь. Матка без памяці крычала. А пасля і іх забілі...

**ЖУК Вера Осіпаўна (1905 г., в. Верхняя Стунжава):**

— Брухаты немец, немалады, камандаваў. Спачатку пад мур мельніцы паставілі чалавек 300. Потым, відаць, падумалі, што няўдобна — многа народу на бальшаку будзе ляжаць. Выбралі 20 чалавек. Астатніх — у сушылку...

**СКРЫПКА Аляксандр Сцяпанавіч (1895 г., в. Росіца):**

— На тым баку ракі абора стаяла. Пётра Міцкевіч, а ён у касцёле на вежах схаваўся і трое сутак ляжаў там, расказваў, што з той аборы вырвалася жанчына і бегла, рукі разняўшы. А яе карнікі на штыкі паднялі і ў агонь. А ў Забароўцы стаяла распяцце. Сагналі ўсіх да крыжа і загадалі: «Станавіцеся на калені і — маліцца!» Паставілі людзей у рад і кулямётам перавялі.

**Выпіска з загада № 25 па брыгадзе імя Свярдлова, в. Мілавіды:**

«16 лютага г.г. вораг сканцэнтраваў свае сілы ў Латвіі, Дрысе, Бігосаве, з дапамогай самалётаў пачаў сваю грабежна-разбойніцкую дзейнасць. У Дрысенскім і Асвейскім раёнах на сваім шляху вораг чыніў зверскую расправу з мірным насельніцтвам. Жыхароў, якія не паспелі выйсці з вёсак, зганяюць у хаты, хлявы і спальваюць, таго, хто спрабуе ўцякаць, расстрэльваюць... Жывёлу, хлеб і хатнія рэчы нямецкія бандыты забіраюць і адпраўляюць у тыл.

16 лютага г.г. нашы слаўныя партызаны — народныя мсціўцы ўступілі ў бой з ненавіснымі нямецкімі бандытамі.., праяўляючы стойкасць, мужнасць і геройства. За гэты час партызаны знішчылі сотні фашысцкіх мярзотнікаў...»

**МАРХЕЛЬ Савелій Ігнатавіч (1927 г., в. Межылы):**

— У той дзень з боку Росіцы бачым — шарэнгамі ідуць, у маскхалатах. І флаг нясуць нейкі: чорны крыж на ўсё палотнішча. Хто куды, а я ў пуню кінуўся. Па адзін бок мары стаялі снапы вазіць, па другі бок — сена. Бачу — падышоўда. Ужо будыніна дагарала, дык гэтых жанчын у жар кінулі. Адзін нямецкі памагаты здзекаваўся над маёй сяброўкай. А месяц жа назад прыходзіў з-за кардону, танцавалі разам.

А ў касцёле як было. Ад жанчын дзяцей адбіраюць і бабулькам аддаюць, каторых паліць выводзілі. А матка рве на сабе валасы, пена пойдзе з роту, то й памрэ зараз жа.

Там і ксёндз быў. Яму можна было ўратавацца, але ён узяў крыж, накінуў чорны шалік і пайшоў з людзьмі ў агонь.

**МАРОЗ Вячаслаў Дамінікавіч (1903 г., в. Новыя Марозы):**

— Прывезлі нас у Бігосава. Выпускаюць са станцыі па 30 чалавек. А на вагонах, куды нас садзяць, мелам вялікімі літарамі напісана: «Партызаны». Я іду, а дачушка з другога вагона з люка крычыць: «Тата!»

**З пісьма ленінградкі ПАРАДНІК Надзеі Іосіфаўны (1929 г., в. Карнікі):**

— Вера ў жыццё да мяне вярнулася ў Саласпілсе. Там былі людзі, якія нам гаварылі, што трэба з усіх сіл трымацца і што рускія прыдуць. Гэтыя людзі былі латышамі і, па чутках, камсамольцамі... Але што толькі прыйшлося вытрымаць у кіпцюрах ворага! Аднойчы раніцай з нашага барака выбралі маладых прыгожых дзяўчат, а вечарам яны забеглі да нас з плачам і кінуліся да сваіх родных развітацца. Былі яны памытымі, чыстымі і добра апранутымі. Немцы іх адрывалі ад родных і цягнулі ў аўтобус. Дзяўчаты сказалі, што іх вязуць афіцэрам...

**УСЕЛЕНАК Пётр Іосіфавіч (1922 г., в. Росіца):**

— У Саласпілсе жанчыны станавіліся чорнымі ад гора і мук за сваіх дзяцей. І ў маёй маці адабралі сына — майго брата, і мы знайшліся праз 18 год пасля вайны.

Быў такі выпадак. Галодных і змучаных падлеткаў, здаецца 35—37 чалавек, з Саласпілса вывезлі ў Рыгу. Іх бацькі і старэйшыя браты былі ў партызанскіх атрадах ці на фронце, а маткі ці сёстры — у канцлагерах. Іх хацелі вывучыць на здраднікаў, каб дзесьці пад Псковам яны служылі ў ахове канцлагера. Але хлопцы там узнялі паўстанне і спрабавалі вывесці ўсіх нявольнікаў у партызаны. Немцы жорстка пакаралі іх. Хлопцаў білі нагамі, прыкладамі вінтовак. Павыбівалі ім зубы, павыкручвалі рукі. А потым выклікалі па спіску праз аднаго, распраналі дагала і забівалі. 18 паўпрыляціць да нас салавей. Пра яго мы і песню склалі:

**Ён адкрые вароты і брамы,**
**Знікне плацце ў палоску з плячэй.**
**Ён залечыць сардэчныя раны,**
**Сатрэ слёзы стамлёных вачэй...**

Як хацелася волі! Памятаю, у лагеры задавілі паставога. Адзін вязень пераапрануўся ў яго форму і, быццам немец, вывеў каманду з лагера і павёў у бок вакзала. У той камандзе ўцекачоў быў і Іван Чорны з Ворзава. А як здзекаваліся над намі наглядчыкі... І дзе тыя гады сёння ёсць?

**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Данатаўна:**

— На пажарышчы знайшлі склеп — так на пур 12 бульбы зроблены. Лаз прыкрылі галавешкамі. Праз дзірачку глядзім на свет. Жывём! Аднойчы дачка шэпча: «Мама, нехта пяець!» А гэта ваўкі кругом шараць.

Перацярпелі! Цяпер добра жывецца, абы каб хужэй не было.

Неяк па тэлевізару ішоў фільм пра канцлагер. Немцы з аўчаркамі, здзекі. Я ўся калачуся, а мая ўнучка смяецца: «Чаго ты, бабуля? Гэта ж кіно, гэта ж — няпраўда!» Ім не верыцца, але ж трэба і пра гэта ведаць. А нам — помніць.

***

Так, ёсць такі боль, які не заціхае ў грудзях тых, хто сустрэўся твар у твар з пачварным ворагам. І гэты боль перадаецца нашчадкам. І ўжо асабіста я адчуваю невымерны доўг перад жыхарамі 426 вёсак Верхнядзвінскага раёна, 126 з якіх так і засталіся неадбудаванымі. Перад тымі 3 639 людзьмі, якія загінулі на тэрыторыі сучаснай Верхнядзвіншчыны, калі ўсю злосць за свае ваенныя няўдачы гітлераўцы спаганялі на мясцовым насельніцтве. 35 тысяч салдат з авіяцыяй, артылерыяй у лютым 1943 года немцы кінулі на барацьбу з партызанамі. А калі не ўдалося зваяваць іх, «непрыяцелем» сталі 2 118 дзяцей узростам да 12 гадоў, 310 дзядуль і бабуль, падлеткі, жанчыны, калекі... А яшчэ 2 612 чалавек прайшлі Саласпілс, Майданак, Равенсбрук, Маўтхаўзен, Штутгоф... І толькі дзесяткі выжылі. Па Асвейскай трагедыі БелСЭ дае такія даныя: «Нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі Асвею і большасць суседніх вёсак, забілі каля 4,5 тысячы мірных жыхароў».

Пра гэты край між Дзвіной і Асвеяй, пра лёс яго людзей зараз збіраю матэрыял. Першыя сціслыя запісы з будучай кнігі — вось перад вамі. Хай не гаснуць сэрцы, у жывых і мёртвых не гаснуць.

**Сяргей ПАНІЗНІК.**